*В. Ю. Шыманская (Беларусь)*

# «НАЛІТЫЯ ПЕСНЯМІ ЯБЛЫКІ»: СІМВАЛ ЯБЛЫКА Ў ПАЭЗІІ МАКСІМА ТАНКА

Творчасць Максіма Танка з'яўляецца невычарпальнай крыніцай для даследчыкаў як паэтычнай спадчыны Беларусі, так і ў больш шырокім разуменні – культуры і сімвалаў беларускай нацыі. Адзін з такіх сімвалаў, які яднае ўласна культурную спадчыну беларусаў з сусветнай міфалагічнай культурай святла і цемры, жыцця і смерці, – сімвал яблыка.

Цікава, што пры незлічонай колькасці даследаванняў творчасці Максіма Танка няма прыватных доследаў менавіта гэтага сімвала, у той час як яго аналіз можа стварыць падставы для глыбокіх абагульненняў адносна граняў творчасці славутага паэта сучаснасці і месца гэтай творчасці ў еўрапейскім і сусветным кантэксце.

Магчыма, і мы маглі б мінуць гэты сакральны сімвал нашай культуры, каб не шэраг папярэдніх даследаванняў, накіраваных на супастаўляльны аналіз паэзіі такіх далёкіх па прасторы, аднак блізкіх па духу аўтараў, як Максім Танк і Роберт Фрост [3]. Так, верш Роберта Фроста «After Apple-Picking» («Пасля збору яблыкаў») з'яўляецца адным з самых вядомых і спрэчных твораў паэта, які аналізуецца як прыклад філасофскай лірыкі, асэнсавання жыццёвага і творчага шляху.

Дзякуючы наяўнасці даследаванняў сімвалу яблыка ў творчасці Роберта Фроста [4], мы вырашылі зрабіць спробу аналізу гэтага сімвала ў вершах Максіма Танка, вылучыць на яго аснове аспекты semiятычнай інтэрпрэтацыі гэтага сімвала ў кантэксце беларускай нацыянальнай культуры.

Як сцвярджае В. Сміт у артыкуле «Шэрань на яблыках» (на жаль, пераклад не перадае гульню слоў – frost (Фрост) на яблыках), «яблык мае доўгую і яскравую гісторыю ў сусветным фальклоры і літаратуры» [4, с. 677]. У Ветхім Запавеце забаронены плод дрэва пазнання ў раі выяўляецца ў вобразе яблыка, у Грэцкай міфалогіі – залаты яблык, выкінуты злоснай багіняй у пакой марных прыгажунь, робіцца падставай для Траянскай вайны. Апошні подзвіг Геракла – гэта здабытак залатых яблыкаў з саду Гесперыд [там жа].

У той час як яблык з'яўляецца традыцыйнай садавінай беларусаў і выступае ў ролі міфалагічнага і сакральнага сімвала абрадавых святаў, у беларускім літаратуразнаўстве амаль адсутнічаюць працы, накіраваныя на вывучэнне гэтага сімвала ў кантэксце творчасці пісьменнікаў і паэтаў. Можна прыгадаць матэрыял В. М. Кавальчук пра архетып яблыка ў рамане Т. Новака [1].

Таму, каб прааналізаваць механізмы пераасэнсавання нацыянальных міфалагічных сімвалаў у паэтычнай творчасці на дадзеным матэрыяле, разгледзім асноўныя кірункі семіятычнага ўвасаблення сімвала яблыка ў вершах Максіма Танка.

Першае сімвалічнае значэнне яблыка, якое знітавана з сусветным міфалагічным сімвалам райскага дрэва, – гэта яблык як сімвал жыцця і мудрасці. Такі сімвал мы можам сустрэць у вершы Максіма Танка, прысвечаным славутаму беларускаму садаводу Івану Сікору:

Вы яшчэ не прышчэплівалі свае яблыні?
Як шкада, што Сікора – стары садавод,
Аб якім у нас казкі, легенды складалі,
На змярканні аднойчы згубіў акуляры
І забрыў не дамоў, але ў рай
Або мо на другую планету,
І цяпер нельга з ім нам параіцца.

У гэтым вершы яблык як біблейскі сімвал пазнання і вечнага жыцця выступае ў выглядзе недасяжнага плода, сакрэт якога вядомы толькі заўчасна памёрламу таленавітаму земляку. Максім Танк раіць: *«...абы якімі гатункамі*

*чаранкоў / Вы не спяшайцеся / прышчэплiваць яблынi».* У дадзеным вершы мы бачым міфалагічны біблейскі вобраз яблыка, які з'яўляецца характэрным для многіх культур свету. У творчасці ж Максіма Танка яго філасофскае гучанне ўзмацняецца дзякуючы спасылцы на рэальнага чалавека, які «забрыў у рай».

Алюзіі да біблейскіх вобразаў з'яўляюцца даволі лагічнымі і традыцыйнымі, аднак, як і ў прыгаданай намі на пачатку артыкула легендзе пра яблык Афрадзіты, яблык можа атаясамлівацца з вядзьмарствам, цёмнымі чарамі і спакусай. Так, у вершы «Ападаюць яблыкі» мы бачым менавіта такія вобразы:

Ападаюць яблыкі:
То іх атрасае вецер,
То здзьмухвае кажан,
пралятаючы міма...
То ведзьма саб'е,
зачапіўшы памялом,
То мая суседка іх згубіць,
Выбіраючы самыя спелыя.
І таму гэтыя апалыя яблыкі
Самыя салодкія і спакуслівыя.

У вершы «Маці ўсім забараніла рваць зялёныя ранеты», які напісаны ў гумарыстычным ключы, сутыкаюцца два значэнні яблыка – сімвалічнае біблейскае значэнне райскага яблыка (з алюзіяй да легенды) і першаснае значэнне – яблык як плод дрэва, як спакуслівая садавіна, якой хочуць пачаставацца ўсе дзеці, нягледзячы на строгую забарону:

Маці ўсім забараніла
Рваць зялёныя ранеты.
– Дык чаму ж яны ня спеюць? –
Кожны дзень пытае Света.
Часам прыйдзе ў сад цяністы
І надкусіць яблык тайна.
Як яе прабабцы Еве,
Плод здаецца незвычайным.
Колькі яблыкаў у садзе
Даспявае кожным летам
Са слядамі гэтых вострых,
Дробных зубкаў нашай Светы!

У нарысе Уладзіміра Калесніка «Будзённы дзень з Максімам Танкам» прыгадваецца выпадак, калі паэт сумаваў па страчаным ураджаі яблыкаў, хваляваўся за гэты ўшанаваны беларусамі плод – такі просты і даступны, і ў той жа час такі кволы і недаўгавечны: «Што тут казаць пра бульбу, бульба пацярпець можа, а вось яблыкі... Навалам усё лета і ўсю восень ляжаць. Псуецца такі прадукт. Адзін жа толькі заводзік, дзе сок выціскаюць– на ўвесь раён!.. Старшыні калгасаў ажно за галавы хапаліся: «Бяда! Садзілі сады, лепшыя землі занялі, а карысці, лічы, ніякай, адно расчараванне...» [2, с. 44–45]. У гэтым кароткім урыўку мы бачым захапленне паэта ўраджаем, бачым, што яблыкі для яго – гэта сапраўдная каштоўнасць.

Наступны сімвалічны змест яблыка – яблык як сімвал жыццёвага шляху, вобраз дзяцінства, увасабленне повязі часоў і пакаленняў:

Зноў ранак вясновы, і яблыня,
Як маці на памяць аб нечым
На хустачцы цёмна-зялёнай,
Завязвае вузялкі-яблыкі.

Блізкім да гэтага вобраза з'яўляецца ўвасабленне яблыка як сімвала маладосці. У вершы, які Максім Танк прысвяціў жонцы ў 1981 годзе, ізноў пераплятаюцца традыцыйныя нацыянальныя і біблейскія міфалагічныя

матывы: маладосць і прыгажосць жонкі паэт параўноўвае са спакуслівай прыгажосцю Евы ў Эдэме, апяваючы простае сямейнае шчасце, якое не могуць парушыць ні «блудлівы Змей», ані «наіўны Бог»:

Ня вер найвярнейшым сяброўкам
І нават люстэрку ня вер,
Што ты не такою прыгожай
Нібы выглядаеш цяпер.
Бо я цябе бачу заўсёды,
Хоць шмат прамінула гадоў,
Такой жа, якой цябе стрэціў
У засені райскіх садоў,
Калі яблык мне падарыла,
А з ім – і сваю маладосць
Блудліваму Змею на зайздрасць,
Наіўнаму Богу – на злосць.

Вышэй мы разгледзелі сімвалічныя вобразы яблыка ў вершах Максіма Танка. Аднак акрамя канатацый, звязаных з міфалагічным і філасофскім светаўспрыманнем, вобраз яблыка ў творах паэта мае і даволі натуральныя, уласцівыя гэтай садавіне, прыметы. І ў гэтых адносінах мы можам разважаць пра сінестэтычныя сродкі перадачы мастацкага вобраза ў паэзіі.

Праз усталяванне падабенства і мастацкага пераносу паміж сумежнымі і несумежнымі пачуццямі аўтар ажыццяўляе рэалістычнае адлюстраванне рэчаіснасці, пры гэтым прыцягваючы да працэсу стварэння вобраза разнастайныя органы пачуццяў. Дзякуючы выкарыстанню сінестэзіі паэтычныя вобразы найбольш поўна і сапраўдна ўспрымаюцца чытачом, выклікаюць у яго вір уласных успамінаў і асацыяцый.

Ва ўжо разгледжаным вышэй вершы да Івана Сікоры вобраз яблыка надзяляецца цэлай гамай сінестэтычных адсылак: гук (песні і звон), колер (чырвань), пах (пах зямлі) і ўспаміны:

А ён, помню, хацеў падарыць чаранкі,
Прышчапіўшы якія, мы мелі б у садзе яблыкі,
Налітыя песнямі, звонам пчаліным,
Чырванню ўсходаў і захадаў сонца,
Пахам неба, зямлі, успамінамі.

Шмат сінестэтычных вобразаў сустракаем у вядомых хоку Максіма Танка. Колер: *У белай місе, / нібы вока восені, / чырвоны яблык* (чырвоны). *Зімнае неба. / З трэскам падае на дол / празрысты яблык* (празрысты). Смак: *Пад ляскоўкаю / нечакана знайшоўся / салодкі яблык.* Тэмпературныя адчуванні: *Што мне трэба ўзяць? / Яблык у кішэнь паклаў. / Холад раніцы.* Пах: *Лілея ў шклянцы, / дух яблыкаў-антонаў, / слёзы каханкі.*

Такім чынам, прааналізаваўшы сімвалічнае значэнне вобраза яблыка ў вершах Максіма Танка, мы прыходзім да высновы, што гэты вобраз сінтэзуе ў сабе традыцыйныя сусветныя міфалагічныя матывы біблейскага саду, яблыка як сімвала жыцця і мудрасці, а таксама даволі рэалістычныя спасылкі да ўласнага вопыту чытача – праз апеляцыю да сінестэтычных адчуванняў, усталяванне суадносін паміж жыццёвым вопытам і сімвалам.

**Літаратура**


1. Кавальчук, В. М. Архетып яблыка як сродак паглыблення антываеннага пафасу рамана Т. Новака «А як будзеш каралём, а як катам будзеш» / В. М. Кавальчук // Актуальныя праблемы сучаснага літаратурнага працэсу : матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Брэст, 20 лістапада 2019 года / УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна» (Брэст) ; рэд. кал.: Л. В. Леванцэвіч [і інш.]. – Брэст : БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2020. – С. 77–82.
2. Калеснік, У. Будзённы дзень з Максімам Танкам / У. Калеснік // Зорны спеў : літаратурныя партрэты, нарысы, эцюды. – Мінск : Маст. літ., 1975. – С. 2–68.

3. Шыманская, В. Ю. Бярозы на мяжы: медытатыўная лірыка Максіма Танка і Роберта Фроста / В. Ю. Шыманская // Дзясятыя Танкаўскія чытанні (да Года культуры ў Беларусі) : зб. навук. артыкулаў / Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка ; рэдкал.: В. Д. Старычонак (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2016. – С. 414–416.
4. Smith, V. FrostontheApple / V. Smith // InterdisciplinarystudiesinLiteratureandEnvironment. – Vol. 23, Issue 4. – November 2016. – P. 677–693.

*М. Г. Ясінская (Беларусь)*

## ТЭМА КАХАННЯ Ў АПОВЕСЦІ У. КАРАТКЕВІЧА «СІВАЯ ЛЕГЕНДА»: АДМЕТНАСЦЬ РАСКРЫЦЦЯ

Мабыць, самае прыгожае пачуццё, якое даецца чалавеку ў жыцці, гэта каханне. Паэты і пісьменнікі розных эпох апявалі яго. Беларускі мастак слова У. Караткевіч таксама напісаў шмат твораў, прысвечаных каханню. Адзін з яркіх узораў увасаблення гэтай тэмы – аповесць «Сівая легенда» (1961).

У аснове твора – вядомая ў фальклоры і літаратуры гісторыя пра багатага хлопца і бедную дзяўчыну, якія ўпадабалі адно аднаго. У аповесці закаханыя з розных сацыяльных асяроддзяў увасоблены ў вобразах нобіля Рамана Ракутовіча і прыгоннай Ірыны. Каханне герояў разгортваецца на фоне паўстання на Магілёўшчыне ў пачатку 1630-х гадоў пад кіраўніцтвам Ракутовіча. У яго барацьбе вельмі важным выступае асабісты складнік: Раман імкнецца вызваліць каханую, зруйнаваць штучныя, але вельмі трывалыя межы, якія іх раздзяляюць.

Раман Ракутовіч паспрабаваў выкупіць свабоду Ірыны, прыгоннай свайго сябра Аляхно Кізгайлы. Аднак той адмовіў яму, паслухаўшыся жонкі Любкі: дзе ж гэта бачылі, каб дваранін ажаніўся з халопкай. З гэтага пачалася вайна паміж былымі сябрамі.

Адносіны самога Кізгайлы з жонкай нельга назваць шчаслівымі і гарманічнымі. Ён яе безнадзейна раўнуе, а яна пагарджае ім. «*Яны былі зусім непадобныя адно на аднаго, муж і жонка. У яго сухі жоўты твар, які пачынаў друзнуць, вочы фанатыка, шалёныя і вартыя жалю, валасы да плячэй. А яна – з яе анёла можна было б маляваць. Толькі, ведаеце, не дужа добрага анёла*» [1, с. 12]. Нават з партрэтнай характарыстыкі відаць, што Любка мацнейшая за мужа, таму Аляхно і слухаецца яе ва ўсім. Менавіта Любка не захацела, каб муж адпускаў Ірыну, і была не супраць, калі бедную дзяўчыну адправілі ў магілёўскую турму. Справа ў тым, што яна кахала Рамана. Ні для каго не сакрэт: жанчына, калі ў яе з'яўляецца саперніца ці калі яе пачуцці не заўважаюць, здольная на многае. Можна сказаць, што менавіта з-за ўпартасці і супраціўлення Любкі Раман вырашыў дзейнічаць сілай.

Увогуле Ракутовіч моцны і смелы чалавек. Дзеля таго, каб ўратаваць Ірыну і родную зямлю, ён вырашыў узняць паўстанне. Ісці да самага канца, змагацца за дарагое можа толькі сапраўдны, караткевічаўскі, беларус – бясстрашны, рашучы, мужны. Воблік героя выяўляе яго характар – «барвяны ўладар», «барвяны ваяўнік»: «*Аблічча, што наганяе жах. Але жахлівей за ўсё былі вочы, незразумелыя па колеру, то шэрыя, то сталёвыя. То залацістае ў ім прамільгне, то нават трохі зялёнае, раз'юшанае. Доўгія, светлыя, незразумелыя вочы.* <...> *галава была закінутая назад, бы ў нязмернай гардыні, а жылістая рука ўладна сціскала павады. І конь адчуваў гэтую руку і ішоў паслухмяна, дрыжучы кожнай жылкай, касавурачы шалёным вокам і стрыгучы вушамі* [1, с. 41].

Ракутовіч захапіў Кісцяні Кізгайлы, а самога гаспадара забіў. Раману было шкада былога сябра, а вось Любка не вельмі засмуцілася. Амаль адразу пасля смерці мужа яна прызналася ў сваіх пачуццях Раману, прасіла забыць Ірыну і застацца з ёю. Зразумела, што Ракутовіч адмовіўся. Ён добра ведаў, што пасля